Побач з вобразам маці, феноменам яе нязгаснай любові, суіснуе ў творчасці паэта тэма кахання. Лірычнаму герою ўласцівы самыя розныя пачуцці: ад бязмежнага здзіўлення перад цудам жаночага хараства, радасці кахання да роспачы, расчаравання, забыцця. У інтымнай лірыцы аўтара сустакаюцца наступныя жаночыя вобразы: таямнічая незнаёмка (“Не маўчы, незнаёмка, скажы…”, “Ты адкуль, прыгажуня такая?...” “Мне падалося: ты міргнула”), каханая (“Ты кахала мяне, ты туліла мяне”, “Вар’яцею ад твайго пагляду”), забытая жанчына (“Часам зусім без прычыны”, “Нам размаўляць ужо няма пра што”), жанчына-Мадонна (“Летні верш”, “Дзяўчынка натхнёна спявала ў хоры”). Узорам інтымнай лірыкі заслужана можна палічыць верш “Жанчына тонка адчувае хараство”. Высокая культура ўнутранага пачуцця, эмацыянальная напоўненасць, далікатнае адчуванне жаночай прыроды, сцісласць і дакладнасць слова – важнейшыя рысы лепшых вершаў паэта пра каханне.

Плённымі для У. Папковіча, як у колькасным, так і ў плане мастацка-пошукавым з’віўся пачатак новага стагоддзя, Асноўнай ў творчасці паэта стала філасофская лірыка. У разважаннях пра лёс і прызначэнне чалавека аўтар спрабуе асэнсаваць вечныя праблемы людскога існавння, маральныя каштоўнасці жыцця, якія ў сучасным свеце лічацца нямоднымі: “Не дабрыня, а злосны дух // запаланіў людскія сэрцы” [2, с.33]. Філасофскімі матывамі прасякнуты зборнік “На шалях лёсу” (2017), у вершах якога выразна адчуваецца спавядальнасць радка, заглыбленасць ва ўнутраны свет чалавека, аналіз уласнай існасці На няўтульным, урбаністычным скразняку памежжа стагоддзяў, лірычны герой, былы вясковец, сёння гараджанін-інтэлегент падводзіць рахункі пражытага, разважае пра свой драматычны “завейны” лёс (вершы “Залічыце мяне да вар’ятаў”, “Ніхто не вечны на зямлі”, “Мой шлях няпэўны быў”, “Жыццё будзённае меню”, “Здавалася, душа перахварэла”, “Мой лёс – галера і прастол”). У кнізе нярэдка гучыць матыў адзіноты, адчужанасці, душэўнага дыскамфорту. Вельмі адчувальныя ў сённяшняй паэзіі віцебскага творцы рэлігійна-медытатыўныя роздумы. Паэт імкнецца да боскага ў сабе, шукае выратаванне ў малітве, у несупынным унутраным руху да Бога:

Малю Цябе ад ранку і да ночы,
Пазбаў, Гасподзь, мой край ад духаў злых.
О, Бог, адкрый сляпым на праўду вочы,
Вярні глухім да слоў сакральных слых [ 2, с. 79].

У сувязі з вастрынёй нацыянальнай праблемы, занядбанасцю роднай мовы ўзрастае эстэтычная вартасць такіх вершаў, як “О, наша мова…”, “Народнае роднае слова”, “Пішу, як дома гаварылі”. У адносінах да мовы, ў пастаяннай прыхільнасці да сакральнага слова – прынцыповая грамадзянская пазіцыя паэта.

У. Папковіч – чалавек добразычлівы ў адносінах да сяброў, пісьменнікаў, і гэта, напэўна, адна з прычын, што ён часта звяртаецца да жанру прысвячэння. Шчырыя радкі адрасуюцца В. Быкаву, Р. Барадуліну, Я. Сіпакову, Д. Сімановічу, А. Канапельку, С. Рублеўскаму, Ф. Гумену і інш. Туга па страчаным і нявдзейсненым, разважанні пра творчасць – гэта той пачуццёвы вопыт, якім магчыма падзяліцца з сябрамі.

**Заключэнне.** Такім чынам, даследуючы тэматычна-вобразны свет паэзіі У. Папковіча, можна зрабіць наступныя вывады. Тэматычная прастора творчай спадчыны паэта з архетыповым вобразамі роднага дома, маці, каханай, душы, мовы з грамадзянска-публіцыстычнымі, філасофска-медытатыўнымі матывамі і жыццясцвярджальным пафасам захапляе перш за ўсё жыццёвай мудрасцю і шчырай спавядальнасцю, дакладнасцю ўласна-біяграфічнага і эмацыянальнага вопыту, пільнай увагай да нюансаў чалавечага быцця.


1. Папковіч, У. На тым стаю / У. Папковіч. – Віцебск: Віцебская абласная друкарня. – 2004. – 223 с.
2. Папковіч, У. На шалях лёсу / У. Папковіч. – Віцебск: Копі-цэнтр “Колер”. – 2017. – 107с.
3. Папковіч, У. Як ёсць… / У. Папковіч. – Мінск: Медысон. – 2015. – 103 с.


## ЛАГІЧНАСЦЬ ЯК КАМУНІКАТЫЎНАЯ ЯКАСЦЬ ТЭКСТАЎ РОЗНЫХ СТЫЛЯЎ


*Г.К. Семянькова*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Да камунікатыўных якасцяў маўлення адносяцца яго правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня, дарэчнасць, багацце, сцісласць, выразнасць і вобразнасць. Лагічнасць прадугледжвае паслядоўнасць, несупярэчлівасць і аргументаванасць выкладання думак. Гэтая



Рэпазіторый ВДУ

камунікатыўная якасць характарызуе структуру маўлення, яе арганізацыю і ацэньвае сэнсавыя аб'яднанні маўленчых адзінак з пункту погляду законаў логікі і правільнага мыслення.

Мэта артыкула – выяўленне прычын алагічнасці ў тэкстах розных стыляў.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужылі прыклады (агульная колькасць – 50 адзінак), выбраныя аўтарам з тэкстаў афіцыйна-справавога, навуковага, мастацкага, публіцыстычнага, размоўнага стыляў. Для ілюстрацыі парушэнняў лагічнасці маўлення выкарыстаны апісальны метад даследавання

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Для дасягнення лагічнасці мыслення і выказвання трэба, каб яны адпавядалі асноўным лагічным законам – закону тоеснасці, супярэчлівасці, выключэння трэцяга, дастатковага абгрунтавання.

Паводле *закона тоеснасці* кожная думка ў працэсе аднаго абмеркавання павінна заставацца нязменнай, захоўваючы адзін і той жа сэнс. Гэта значыць, што прадмет думкі на працягу ўсяго выказвання павінен заставацца нязменным. Тыповая памылка – падмена паняцця або тэзіса, калі прамоўца змяняе тэму і пачынае гаварыць пра іншае. Лагічнай памылкай будзе, напрыклад, пры характарыстыцы спартыўных здольнасцяў студэнта, якога збіраюцца ўключыць у зборную ўніверсітэта (факультэта) па валейболе, ацэньваць яго поспехі ў вучобе, самадзейнасці або грамадскай дзейнасці.

Прыкладам парушэння закона тоеснасці з'яўляецца змешванне амонімаў, а таксама розных значэнняў мнагазначнага слова, што вядзе да двухсэнсоўнасці: *Маці сказала сыну, што трэба* ***паліць*** *траву* (паліць[1] ад *ліць* 'намачыць'; паліць[2] 'спальваць'); *Студэнты* ***праслухалі*** *тлумачэнне прафесара* (праслухаць – 1) 'выслухаць ад пачатку да канца', 2) 'слухаючы, не ўспрыняць, не пачуць'.

Паводле *закона супярэлівасці* два супрацьлеглыя выказванні пра адзін і той жа прадмет, узятыя ў адзін і той жа час і ў адных і тых жа адносінах, не могуць быць адначасова праўдзівымі. Напрыклад, калі з дзвюх думак *Залік прызначылі на заўтра* і *Залік прызначылі не на заўтра* адна сапраўдная, то другая – несапраўдная.

Тыповая памылка – размяшчэнне ў адным тэксце сказаў, у якіх сцвярджаецца супрацьлеглае: *1) Эдуард* ***зразумеў****, што жаніцьба з Антанінай была,* ***мусіць****, несур'ёзным крокам. 2) Астрамірава Евангелле аздоблена* ***вялікімі мініяцюрамі****.*

З законам супярэчлівасці звязаны *закон выключэння трэцяга*: з двух супрацьлеглых выказванняў адно праўдзівае, другое – не, а трэцяга не дадзена. У прадметаў аб'ектыўнага свету якая-небудзь прыкмета прысутнічае або адсутнічае. Так, напрыклад, з двух меркаванняў *У птушкі ёсць крылы* і *У птушкі няма крылаў* першае праўдзівае, другое няпраўдзівае, а трэцяга, прамежкавага паміж гэтымі двума, быць не можа.

Не могуць быць адначасова праўдзівымі два тэзісы, вылучаныя ў межах сказа *Месяц – гэта маленькая планета і спадарожнік Зямлі*, бо планетай з'яўляецца нябеснае цела, якое круціцца вакол зоркі, спадарожнікам – нябеснае цела, якое круціцца вакол планеты. Таму Месяц не можа быць адначасова планетай і спадарожнікам.

Тыповыя памылкі – гэта ўдакладняльныя выказванні, якія супярэчаць аднаму з выказванняў. Разгледзім прыклад: *У іх зусім не было зброі. На пяцярых толькі два пісталеты і адна граната.* Выпраўлены варыянт можа выглядаць наступным чынам: *У іх было* ***мала*** *зброі. На пяцярых толькі два пісталеты і адна граната.*

Паводле *закона дастатковага абгрунтавання* ўсякая праўдзівая думка павінна быць абгрунтавана іншымі думкамі, праўдзівасць якіх ужо даказана. На гэтым законе грунтуецца важны юрыдычны прынцып – прэзумпцыя невінаватасці. Тыповая памылка – сцверджанне, якое не даказана ні прыкладамі, ні разважаннямі.

Дасягненню лагічнасці спрыяе правільная пабудова доказу, які складаецца з трох элементаў: *тэзіс* (думка, якую трэба даказаць), *аргументы* (палажэнні, з дапамогай якіх абгрунтоўваецца, даказваецца тэзіс), *дэманстрацыя,* або *форма доказу* (спосаб лагічнай сувязі паміж тэзісам і аргументамі, вывядзенне сапраўднасці тэзіса).

Размяжоўваюць некалькі відаў аргументаў: 1) правераныя адзінкавыя факты (фактычны матэрыял: статыстычныя дадзеныя аб насельніцтве, тэрыторыі дзяржавы, выкананні плана, колькасці ўзброення, паказанні сведкаў, подпісы на дакументах, навуковыя дадзеныя, навуковыя факты). Роля фактаў у абгрунтаванні палажэнняў, у тым ліку навуковых, вялікая. Цаной дзесяткаў тысяч праведзеных вопытаў, збору навуковых фактаў І.У. Мічурын стварыў стройную сістэму вывядзення новых гатункаў раслін. Спачатку ён захапіўся працамі па



Репозиторий ВГУ

акліматызацыі паўднёвых і заходнееўрапейскіх пладовых культур ва ўмовах сярэдняй паласы Расіі. Шляхам гібрыдызацыі ён здолеў стварыць звыш за 300 гатункаў пладовых і ягадных культур. Гэта яскравы прыклад таго, як сапраўдны навуковец збірае і апрацоўвае велізарны фактычны матэрыял; 2) азначэнні; 3) аксіёмы – меркаванні, якія прымаюцца ў якасці аргументаў без доказу; шырока прымяняюцца ў матэматыцы, механіцы, тэарэтычнай фізіцы, матэматычнай логіцы і іншых навуках; 4) раней даказаныя законы навукі і тэарэмы.

Тэзіс: кошкі былі прыручаны чалавекам пазней за сабак. Аргументы: 1) раскопкі культурных слаёў паказалі, што рэшткі шкілета сабак сустракаюцца ў паселішчах чалавека-паляўнічага; рэшткі шкілета котак з'яўляюцца толькі тады, калі чалавек стаў займацца земляробствам (кошкі выкарыстоўваліся для барацьбы з грызунамі); 2) паляванне з'яўляецца больш старажытным, чым земляробства, заняткам чалавека.

Для абвяржэння тэзіса факты іграюць таксама вялікую ролю. Напрыклад, каб абвергнуць тэзіс *На Венеры можа існаваць арганічнае жыццё*, дастаткова прывесці наступныя дадзеныя: тэмпература на паверхні Венеры 470–480 °С, ціск – 95–97 атмасфер. Гэтыя факты сведчаць пра тое, што жыццё на Венеры немагчымае.

З пункту погляду моўнай культуры небяспечнымі з'яўляюцца прыхаваныя алагізмы: *Быў арганізаваны паказ слайдаў аб развіцці гарадоў і культуры Францыі.* Няправільна арганізаваны рад аднародных членаў: паняцці *горад* і *культура* аб'яднаны злучнікам «і».

Прычынай нелагічнасці выказвання можа стаць падмена паняцця, якая часта ўзнікае ў выніку няправільнага словаўжывання: *Дрэнна, калі ва ўсіх кінатэатрах горада дэманструецца адна і тая ж назва фільма.* Вядома, дэманструецца фільм, а не яго назва. Можна было напісаць *Дрэнна, калі ва ўсіх кінатэатрах горада дэманструецца адзін і той жа фільм.*

Важнай умовай стварэння лагічнага выказвання з'яўляецца правільны парадак слоў. Вось прыклад няўдалага словаразмяшчэння ў сказе: *Нагадваю бацькам, што без пуцёвак дзеці на ўсе базы адпачынку не прымаюцца*. Гэты сказ можна выправіць наступным чынам: у пачатак вынесці акалічнасць месца і зняць слова *ўсе: На базы адпачынку дзеці без пуцёвак не прымаюцца.*

Асабліва часта выкарыстоўваюць родавае найменне замест відавога, што пазбаўляе маўленне лагічнасці: *У пакоі стаялі сталы, крэслы, мэбля з чырвонага дрэва* (відавочна, аўтар меў на ўвазе, што першыя прадметы не былі зроблены з чырвонага дрэва, але ўсё роўна такое спалучэнне недапушчальнае). *Трэба падумаць аб кармах на зіму для жывёлагадоўлі* (трэба *корм для жывёл, жывёлы*).

**Заключэнне.** Такім чынам, логіка падчас выступлення з'яўляецца ўмовай паспяховасці зносін. Яна забяспечвае ўменне зразумела выказваць думкі, даказваць і аргументаваць сфармуляваныя тэзісы, спрачацца з існуючым або неіснуючым апанентам, аспрэчваць антытэзісы, антыаргументы, памылковыя думкі і ідэі. Выступоўца сам павінен верыць у праўдзівасць тых думак, якія ён даводзіць да слухачоў.

## ОТАНТРОПОНИМНЫЕ НАЗВАНИЯ ОЗЕР НА ТЕРРИТОРИИ ВИТЕБЩИНЫ

*Т.И. Синкевич*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

Гидронимическое пространство любой территории представляет собой фрагмент целостной языковой национальной картины мира, которая отражает особенности мышления носителей данной языковой культуры и формирует специфику восприятия окружающего мира. Проблема исследования представляется актуальной, так как названия – факты языка, они переносят нас через века и тысячелетия, позволяют изучать явления прошлого.

Цель статьи – проанализировать названия озер, в основе номинации которых нашли отображение имена собственные.

**Материал и методы.** Материалом нашего исследования послужили названия озер Витебщины. Ведущим методом исследования был описательный метод как триединство приемов наблюдения, анализа и систематизации результатов исследования. При сопоставлении изучаемых фактов с уже известными использовался структурно-сопоставительный метод. Лимнонимы Витебщины сопоставлялись с гидронимическим материалом соседних территорий, что позволило посмотреть на каждое отдельное название как на элемент системы наименований той или иной территории. Кроме того, для аргументации результатов наблюдения применялись элементы статистического метода посредством использования методики количественных подсчетов.



Репозиторий ВГУ